*УДК 930.1(09)(БЕИ)*

*А. А. САВІЧ*

# ЭПІСТАЛЯРНАЯ СПАДЧЫНА М. С. АРЭХВЫ ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТАРЫЯГРАФІІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна*

*(Паступіў у рэдакцыю 16.07.2013)*

Для больш адэкватнага разумення самых разнастайных аспектаў гісторыі і гістарыяграфіі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. значнай падставай з'яўляецца асабістая перапіска былога кіруючага дзеяча КПЗБ М. С. Арэхвы. З яго асобай звязана вялікая арганізацыйна-навуковая і асабістая даследчая работа па вывучэнні гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага вызваленчага руху Заходняй Беларусі. З 1956 па 1984 г. М. С. Арэхва працаваў старшым навуковым супрацоўнікам у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Нагадаем, што ў пачатку 1930-х гадоў ён быў супрацоўнікам замежнай рэдакцыі КПЗБ, а потым некаторы час узначальваў Камісію па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Беларускай акадэміі навук.

Вядома, што ў другой палове 1950-х гадоў пасля палітычнай рэабілітацыі КПЗБ падчас працы XX з'езда КПСС пачалася інтэнсіфікацыя вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., нацыянальна-вызваленчага руху, а дакладней яго рэвалюцыйнай плыні – КПЗБ і КСМЗБ. Гэтае рашэнне было адным з важнейшых эпізодаў распачатай у СССР дэсталінізацыі, для ажыццяўлення якой факт роспуску ў 1938 г. камуністычных партый Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія фактычна дзейнічалі па распрацаваных у Маскве дырэктывах, успрымаўся як відавочнае злачынства Сталіна. Гэтыя абставіны адкрывалі шырокія магчымасці для вывучэння гісторыі дзейнасці кампартыі, у тым ліку і КПЗБ. Такі паварот з энтузіязмам успрынялі ветэраны рэвалюцыйнага руху – былыя члены КПЗБ. Іх аб'ядноўваў своеасаблівы карпаратыўны інтарэс, жаданне асабістай палітычнай рэабілітацыі, яны з рознай актыўнасцю ўключыліся ў працу па стварэнні гісторыі партыі, якой фактычна не было. Да гэтага трэба дадаць тое надзвычай важнае, што звязана з іх дзейнасцю ў Заходняй Беларусі як супрацоўнікаў па лініі НКУС-Камінтэрна: на момант 1950-х гадоў былыя ветэраны прайшлі шматлікія партыйныя праверкі, удзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, у тым ліку ў якасці кіраўнікоў спецатрадаў НКУС на акупаванай тэрыторыі, прайшлі службу на адказных пасадах у Войску Польскім і Міністэрстве грамадскай бяспекі Польшчы і фактычна былі ветэранамі дзяржбяспекі СССР.

Менавіта ветэраны першымі гучна сказалі сваё слова ў справе рэабілітацыі КПЗБ і дзеячаў беларускага камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі. Шмат для разгортвання рэабілітацыі КПЗБ зрабіў былы член цэнтральнага кіраўніцтва КПЗБ М. С. Арэхва. У ліпені 1956 г. па ініцыятыве М. С. Арэхвы была склікана нарада былога актыву КПЗБ і камсамолу Заходняй Беларусі. Нарада абмеркавала асноўныя кірункі распрацоўкі гісторыі КПЗБ і КСМЗБ. У верасні таго ж года часопіс «Камуніст Беларусі» апублікаваў рэдакцыйны артыкул «Нарада па пытаннях гісторыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі», у якім падрабязна выкладаліся абмеркаваныя на нарадзе пытанні і прынятыя рэкамендацыі.

М. С. Арэхва на працягу 1957–1983 гг. ажыццявіў вялікую навукова-даследчую работу, якая, паводле створанай ім уласнай бібліяграфіі, склала 80 пунктаў, сярод якіх артыкулы па гісторыі Заходняй Беларусі і КПЗБ у зборніках успамінаў, манаграфіях, рэцэнзіі, удзел у складанні зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, уступныя словы да разнастайных выданняў [22, арк. 5–18]. Акра-

мя М. С. Арэхвы актыўна займаліся асвятленнем у друку пытанняў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі С. Р. Анісаў, В. П. Ласковіч, Я. Г. Міско, Ф. Б. Пірышка, іншыя ветэраны, якія ў сваіх працах папулярызавалі гісторыю нацыянальна-вызваленчага руху, прапагандавалі ідэі і гісторыю КПЗБ, усхвалялі яе дзеячаў [27, с. 47].

Публікацыі М. С. Арэхвы [4; 11; 12; 24; 25] станоўча паўплывалі на разгортванне навуковай працы не толькі па праблемах КПЗБ, але і па іншых пытаннях заходнебеларускай тэматыкі. Аднак ухваленыя ў вышэйшых навуковых і партыйных інстанцыях яны ў першую чаргу мелі важнае метадалагічнае значэнне таму, што акрэслівалі падыходы да ацэнкі і адлюстравання тых ці іншых падзей нацыянальна-вызваленчага руху, вызначалі станоўчыя моманты, заслугі, поспехі, ці, наадварот, недахопы і памылкі ў дзейнасці КПЗБ. Маючы перад сабой такую своеасаблівую праграму-схему, гісторыкам заставалася напоўніць яе фактамі, падзеямі, высновамі, якія павінны былі пацвердзіць загадзя прапанаваныя пазіцыі. Ва ўсялякім выпадку, названыя канцэптуальныя падыходы замацаваліся і панавалі ў гістарыяграфіі да пачатку 1990-х гадоў, вызначаючы змест навуковых даследаванняў.

Палітычная рэабілітацыя КПЗБ стымулявала напісанне і публікацыю мемуараў яе ветэранаў, актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі [1–3; 6–10; 13–14; 23; 28–31].

Трэба адзначыць, што прыведзеныя публікацыі былі накіраваны не на ўсталяванне аб’ектыўнай інфармацыі, а на сцвярджэнне патрэбных тагачаснай савецкай ідэалогіі гістарычных уяўленняў. Такая сітуацыя можа тлумачыцца відавочным і эфектыўным кантролем з боку кампетэнтных партыйна-дзяржаўных органаў за працэсам напісання і публікацыі мемуараў і даследаванняў. Адпаведны кантроль быў і з боку былых адказных работнікаў КПЗБ, удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Яны адыгрывалі значную цэнзурную ролю ў фарміраванні гістарыяграфічнай традыцыі адлюстравання названых пытанняў. Сам М. С. Арэхва выступаў у ролі пасрэдніка-фільтра паміж аўтарамі мемуараў – былымі ўдзельнікамі рэвалюцыйнага руху, якія даверліва ставіліся да яго, і выдавецтвамі, куды паступалі ўспаміны пасля адпаведнага рэцэнзавання і зацвярджэння. Здаралася, што пасля знаёмства з пададзенымі рукапісамі М. С. Арэхва вымушаны быў прыпыняць іх далейшы рух да выдавецтва, бо выяўлялася відавочнае імкненне аўтараў гаварыць пра забароненыя тэмы, у прыватнасці, пра рэпрэсіі ў дачыненні да іх як падазроных членаў забароненай КПЗБ, якія прайшлі праз суды і незаслужана адбылі пакаранне. Пры гэтым, як у выпадку з успамінамі Г. М. Мухі-Мухноўскага, які перадаў для знаёмства М. С. Арэхву свой тэкст, відавочна выяўлялася «нежаданне савецкай улады праліваць святло на “нязручныя” факты ў зусім яшчэ нядаўняй гісторыі» [26, с. 102].

Аналагічнага характару праблемы ўзнімаліся і ў лістах, якія прыходзілі да М. С. Арэхвы. У прыватнасці, І. М. Дрозд расказаў пра трагедыю І. Дварчаніна, з якім асабіста пазнаёміўся ў Мінскай турме. Былы беларускі пасол, якога прывезлі «з паўночных лагераў па нейкай справе» паведаміў «жудасную гісторыю, як рыхтавалі іх да самапаклёпніцтва, пераконвалі, што гэта патрэбна і карысна партыі, што партыя павінна належным чынам ацаніць іх учынак. Яны перасварыліся паміж сабой... Адмовіліся размаўляць са следчым па гэтым пытанні. Прыйшоў прадстаўнік ЦК і аб’явіў, што гэта воля партыі» [19, арк. 34 адв.].

Былыя рэвалюцыянеры-партыйцы выступалі ў адкрытым друку і з рэцэнзіямі на навуковыя працы па пытаннях гісторыі КПЗБ, выказваючы пры гэтым свае далёка не лагодныя заўвагі аўтарам, якія, на думку ветэранаў, прыходзілі да няправільных вывадаў. Напрыклад, высновы Т. А. Глінскай выклікалі рашучую крытыку з боку ветэранаў КПЗБ у выглядзе рэцэнзіі (М. С. Арэхва ў сваёй бібліяграфіі назваў рэцэнзію «рэплікай» [23, арк. 7]) у галоўным партыйным часопісе БССР: «Канкрэтны паказ дзейнасці КПЗБ у прафсаюзах, яе кіруючай ролі ў забастоўках падменены ў кнізе агульнымі разважаннямі пра стан прафсаюзнага руху». Па іх меркаванні, рукапісы работ па гісторыі КПЗБ, як і па іншых праблемах рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, мэтазгодна было б абмяркоўваць у адпаведных «навукова-даследчых установах» з удзелам былых актыўных дзеячаў КПЗБ. Толькі пры гэтай умове, сцвярджалі ветэраны, можна будзе пазбегнуць у будучых працах памылак і недахопаў [24, с. 74–75].

Відавочнаму рэдагаванню падвяргаліся і ўспаміны ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху. Так, напрыклад, у прадмове да зборніка ўспамінаў «Люди нарочанского края» А. І. Залескі ад імя

рэдактараў і складальнікаў зборніка выказаў «глыбокую падзяку былым кіруючым работнікам КПЗБ М. С. Арэхву і Д. І. Разенштэйну за каштоўныя заўвагі, якія яны выказалі па ўспамінах першай часткі гэтай кнігі ў працэсе яе падрыхтоўкі да друку» [5, с. 8]. Таму нядзіўна, што ў названым зборніку адсутнічае непажаданая для куратараў выдання інфармацыя, напрыклад, пра трагедыю КПЗБ 1938 г., рэпрэсіі ў адносінах да былых удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі: асвятленне пытанняў гісторыі КПЗБ павінна было адбывацца толькі ў адпаведным, загадзя вызначаным рэчышчы.

Эпісталярная спадчына М. С. Арэхвы з'яўляецца значнай часткай актыўнай перапіскі на працягу 1940–1980-х гадоў паміж ветэранамі КПЗБ, якія займаліся навукова-публіцыстычнай дзейнасцю па вывучэнні гісторыі партыі. Зместам перапіскі, акрамя высвятлення аклічнасцей лёсу розных асоб, сталі ідэйна-палітычныя і крыніцазнаўчыя пытанні гісторыі Заходняй Беларусі. Перапіска М. С. Арэхвы часткова захоўваецца ў яго асабістым фондзе № 976 у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь і патрабуе асобнага прадметнага даследавання. Фонд змяшчае вялікую колькасць лістоў да М. С. Арэхвы ад яго саратнікаў па КПЗБ, у тым ліку В. З. Харужай, А. Бергман і С. Бергмана, В. П. Ласковіча, С. М. Малько, І. В. Мальца, Ф. А. Цыгельніцкай і іншых, родных былых рэвалюцыянераў, беларускіх і польскіх вучоных, літаратараў, грамадскіх дзеячаў.

Перапіска адлюстроўвае цікавыя і складаныя ўзаемаадносіны паміж аднапартыйцамі, якія часам эвалюцыянавалі ад шчырых і прыязных стаўленняў паплечнікаў па барацьбе і аднадумцаў у адносінах да гісторыі КПЗБ да насцярожаных, крытычных, непрыхільных дачыненняў, у якіх заўважаецца саперніцтва і зайздрасць, падаграваная іншымі былымі аднапартыйцамі. Так, у прыватнасці, адбылося з М. С. Арэхвам і А. Р. Бергман, перапіска якіх выклікае найбольшую цікавасць з-за іх вялікага ўнёску ў справу вывучэння гісторыі КПЗБ. Першапачаткова, дэманструючы добразычлівае стаўленне да адрасата, А. Р. Бергман абмяркоўвала працы ветэранаў КПЗБ. Напрыклад у сваім лісце М. С. Арэхву ад 5 лістапада 1974 г. яна па-сяброўску папракнула яго за неналежны падбор аўтараў зборніка («Здзівіў мяне таксама артыкул Цылі Гурвіч, найперш усяго сам факт, што яна трапіла ў лік Вашых аўтараў...» [16, арк. 9 адв.]). У лісце ад 16 сакавіка 1977 г. А. Р. Бергман узняла пытанне аб І. Дварчаніне, адзначыла параўнальна някепскія матэрыялы разам з фактам з'яўлення «кніжыцы, у якой ён (І. Дварчанін. – *А. С.*) прадстаўлены ў самым брыдкім выглядзе (кніжка Мухі-Міхальскага), належна штосьці зрабіць, каб другім не павадна было» [16, арк. 19]. Адносіны паміж А. Р. Бергман і М. С. Арэхвам рэзка змяніліся ў сярэдзіне 1980-х гадоў. Так, у чарнавым варыянце ліста С. М. Мальцу ад 1 верасня 1986 г. М. С. Арэхва скардзіцца на «дыскусійны артыкул А. Бергман» аб кнізе яго ўспамінаў: «Чаму ў названым артыкуле так шмат жоўці і азлобленасці супраць мяне» [15, арк. 14–14 адв.].

Знаёмства з перапіскай М. С. Арэхвы пацвярджае, што гістарычная рэабілітацыя КПЗБ і ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху мела цяжкасці. Відавочна, і ў партыйна-дзяржаўным кіраўніцтве, і ў навуцы знаходзіліся тыя, каму не падабалася, што былыя «ворагі народу», каго калісьці знішчалі маральна і фізічна, выступаюць на старонках партыйнага друку, не толькі апраўдваюць сваю «варожую» дзейнасць, але і гераізуюць яе. Былі і тыя, якія раўнадушна ці баязліва ігнаравалі новыя павевы ў ідэйна-палітычным і навуковым жыцці, лічылі іх часовымі і небяспечнымі. Паказальнай з'яўляецца сітуацыя ў Інстытуце гісторыі. Сярод арганізацыйных мерапрыемстваў сектара гісторыі Савецкай Беларусі, зацверджаных 13 сакавіка 1956 г., «па перапрацоўцы II тома гісторыі БССР у святле рашэнняў XX з'езда КПСС» не было асобнай главы, прысвечанай гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., а толькі – «Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай беларускай савецкай сацыялістычнай дзяржаве», адказным за напісанне якой быў прызначаны Ц. С. Гарбуноў [32, арк. 86, 90].

Каб актывізаваць працэс даследаванняў КПЗБ і яе папулярызацыі на старонках друку, патрабаваліся значныя арганізацыйныя захады. Цікавым у гэтым сэнсе ўласным вопытам па пераадоленні негатыўнага стаўлення да рэабілітацыі партыі і яе членаў падзялілася А. Р. Бергман. У сярэдзіне 1960-х гадоў ёй «давялося ў асноўным самой разгрызаць і памучыцца над разуменнем многіх пытанняў, звязаных з Грамадой. І толькі ў 1965 годзе ў Маскве атрымала архіўныя матэрыялы, па якіх удалося скарэкціраваць свае высновы. Ого! Нямала было перашкод (зразумела, з боку сваіх і пагроз, і чаго толькі хочаш). Але мне дапамагло разабрацца ў самых складаных

пытаннях тое, што я ведала добра механізм дзеяння нашага апарату (ва ўсіх яго звёнах)...» [16, арк. 10].

Перапіска дэманструе актыўныя ўзаемадачыненні М. С. Арэхвы з пісьменнікамі і публіцыстамі, якіх цікавіла заходнебеларуская праблематыка. Сяброўскія даверлівыя адносіны склаліся ў яго з вядомым аўтарам С. С. Кэмрадам, які раіўся адносна так і нерэалізаванага праекта стварэння вялікага гісторыка-біяграфічнага твора, прысвечанага В. З. Харужай: «Коля! Я хачу напісаць раман аб Веры» [19, арк. 5].

Сувязі М. С. Арэхвы ў высокіх партыйных і дзяржаўных інстанцыях былі прычынай звароту да яго па шматлікіх пытаннях асабістага характару, у якіх змяшчаліся просьбы дапамагчы ў вырашэнні самых разнастайных праблем. Невядома, як адбывалася іх вырашэнне, аднак пастаноўка адпаведных пытанняў выклікае цікавасць з навуковага пункту гледжання. Так, з ліста ад 20 чэрвеня 1972 г. С. Бергмана, мужа польска-беларускай даследчыцы А. Р. Бергман, стала вядома пра складаныя акалічнасці асабістага жыцця жонкі Б. А. Тарашкевіча і яе ўдзел у арганізацыі заходнебеларускага камуністычнага падполля. Аўтар паведаміў, што «Вера Андрэеўна Ніжанкоўская (першая жонка Тарашкевіча), якую Ты, здаецца, ведаеш асабіста, знаходзіцца ў вельмі цяжкім матэрыяльным становішчы ... Паводле розных неафіцыйных крыніц вядома, што яна часта выконвала ролю сувязной Тарашкевіча з Ульянавым, Бабровічам, Канчэўскім і іншымі асобамі. Затым – у тыя гады, калі ён сядзеў у турме – яна была сувязным звяном паміж намі і партыяй» [17, арк. 1].

Выклікае асаблівую цікавасць інфармацыя, якая пацвярджае настойлівае неабгрунтаванае імкненне літоўскіх аўтараў падаваць Вільню і Віленшчыну 1921–1939 гадоў як частку літоўскай, а не беларускай гісторыі, беспадстаўнае перабольшванне ролі літоўскіх камуністаў у рэвалюцыйным руху, што грунтавалася на валюнтарысцкім вырашэнні бальшавіцкім кіраўніцтвам пытання прыналежнасці Вільні і Віленшчыны ў кастрычніку 1939 г. [27, с. 71–73]. Такога кшталту «навуковыя адкрыцці» выклікалі абурэнне і рашучы пратэст у шэрагах ветэранаў КПЗБ, напрыклад, у брыгаднага генерала Войска Польскага С. М. Малько, які пражываў у Варшаве і ў сваім лісце ў роспачы звярнуўся да М. С. Арэхвы: «Не ведаю, ці праўда гэта? Кажуць, што ў шэрагу прац т. Каросаса была праведзена Літвінізацыя усёй нашай віленскай работы і скажона прадстаўлена роля Літоўскага бюро» [17, арк. 28].

На трансфармацыю ўзаемаадносін аднапартыйцаў і аўтараў відавочна ўплывалі іх калегі, якія выказвалі меркаванні і сваім стаўленнем да адпаведных пытанняў абвастралі сітуацыю. Відавочна, што каталізатарам пагаршэння ўзаемаадносін былі публікацыі, у прыватнасці ўспаміны М. С. Арэхвы. Яго кніга «Дела и люди КПЗБ» неадназначна была ўспрынята былымі аднапартыйцамі, іх меркаванні ў агульным сэнсе ў сваім лісце М. С. Арэхву выказала Эльжбета Матыль, якая пражывала ў Польшчы: «Некаторыя таварышы лічаць, што занадта ў ёй мала аб канкрэтнай дзейнасці КПЗБ» [20, арк. 14]. Акрамя гэтага, з ліста Ф. А. Цыгельніцкай ад 7 кастрычніка 1984 г. вядома аб стаўленні С. Р. Анісава да кнігі М. С. Арэхвы: «Зараз галоўнае – аб тваёй кнізе. Аб тым, што ў Анісава адмоўнае меркаванне я ведаю». Тая ж Ф. А. Цыгельніцкая ў сваім лісце М. С. Арэхву ад 2 студзеня 1987 г. настойліва дакарала яго за адсутнасць цвёрдасці ў саперніцтве з А. Бергман: «Не, дарагі сябар, я з табой не згодна, што ты так хутка саступаеш Бергман гісторыю КПЗБ ... Для сучасных савецкіх гісторыкаў ты з'яўляешся і застанешся ў памяці як найгалоўнейшы гісторык КПЗБ» [21, арк. 17–18, 22–23].

Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што непаразуменне паміж М. С. Арэхвам і А. Р. Бергман не вычэрпвала нядобразычлівыя ўзаемадачыненні паміж былымі паплечнікамі па барацьбе. Актыўная навукова-публіцыстычная дзейнасць В. П. Ласковіча стала падставай для напружання яго адносін з В. С. Селівонік. Абодва былі аўтарамі ўспамінаў, апублікаваных у зборніках, абодва пражывалі ў Брэсце, знаходзіліся на партыйнай і савецкай рабоце. Аб іх напружаных адносінах становіцца вядома з недатаванага, напісанага паміж 1984 і 1987 гг., ліста М. С. Арэхву ад Ф. А. Цыгельніцкай, якая паведаміла аб «Брэсцкім непрыемным, крайне непрыемным канфлікце паміж Селівонік і Ласковічам». Не паглыбляючыся ў падрабязнасці справы, аўтар выказалася адносна В. П. Ласковіча: «...часта дасылае мне сякія-такія яго публікацыі. Я ведаю, што ён вялікі фантазёр, але колькі я яго прац чытала, хаця з некаторай фантазіяй, я не знайшла нічога

шкоднага (падкрэслена ў тэксце. – *А. С.*) у справе папулярызацыі рэвалюцыйных традыцый, гераічных спраў КПЗБ. Канечне, пісаць трэба сапраўдную праўду...». Застаюцца невядомымі падставы, якія падштурхнулі В. С. Селівонік да надзвычайнага ўчынку – напісання скаргі ў Брэсцкі абкам КПБ. Хутчэй за ўсё гутарка можа ісці пра публікацыі В. П. Ласковіча, ў якіх гістарычная праўда ў разуменні В. С. Селівонік, а магчыма, і яе ўдзел у заходнебеларускім рэвалюцыйным руху, былі скажоныя не на яе карысць. Так ці інакш, але Ф. А. Цыгельніцкая паведаміла, што В. П. Ласковіч «даслаў цэлую папку сваіх публікацый і напісаў аб учынку Васілісы Селівонік. Мы тут некаторыя таварышы разам чыталі і абураны – навошта пісаць скаргу ў абкам ... Увогуле справа вельмі паршывая. У іх гэта нейкія сямейныя дразгі (яны нейкія яшчэ і родзічы), нейкая дзікая зайздрасць. Гэта першы такі выпадак сярод нашых таварышаў» [21, арк. 20–21].

Напэўна, «такі выпадак» сярод ветэранаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі быў не першым, а тым больш не адзіным і не апошнім. Верагодна, што нядобразычлівыя ўзаемаадносіны паміж аўтарамі гісторыі Заходняй Беларусі былі схаваныя ад чытацкай публікі, якая атрымлівала да кожнай юбілейнай даты з гісторыі КПЗБ ці яе актывістаў чарговыя артыкулы ў перыядычным друку аб «палымяных сэрцах», «жыцці, аддадзеным барацьбе», «праве на бяссмерце», што ўсхвалялі дзейнасць заходнебеларускіх камуністаў і камсамольцаў, з якімі пашчасціла працаваць аўтарам. Нядзіўна, што ў такіх публікацыях падзеі нацыянальна-вызваленчага руху, у тым ліку рэвалюцыйнага, адлюстроўваліся крайне суб'ектыўна.

Такім чынам, цікавай і змястоўнай крыніцай па гісторыі і гістарыяграфіі нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі, у першую чаргу КПЗБ, з'яўляецца эпісталярная спадчына М. С. Арэхвы. Лісты, якія захоўваюцца ў яго асабістым фондзе, пацвярджаюць тое, што ў другой палове 1950-х – 1980-я гады ў фарміраванні айчыннай савецкай гістарыяграфіі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. важнае месца належыла ўдзельнікам рэвалюцыйнага руху, ветэранам КПЗБ. Праз іх рэалізоўвалася інтэрвенцыя партыйна-дзяржаўных органаў у гістарычную навуку. Атрымліваючы магчымасць інтэрпрэтацыі падзей недалёкага мінулага, ветэраны атрымалі своеасаблівы карт-бланш у асвятленні падзей так, як яны гэтыя падзеі суб'ектыўна бачылі і ацэньвалі, і, не выключана, так, як ім было патрэбна і зручна. Складвалася своеасаблівая гістарыяграфічная сітуацыя, калі рэканструкцыяй і інтэрпрэтацыяй падзей займаліся асобы, якія ў даследуемых падзеях мелі часам ключавое значэнне, у тым ліку з'яўляліся аўтарамі крыніц у выглядзе адозваў, пастаноў, рэзалюцый, рашэнняў і г. д. На іх падставе ў другой палове XX ст. адбывалася актыўнае даследаванне гісторыі Заходняй Беларусі, у першую чаргу КПЗБ, і ў гэтым працэсе былыя рэвалюцыянеры вырашалі метадалагічныя і цэнзурныя задачы.

## Літаратура


1. *Анісаў, С.* З гісторыі камсамольскага падполля Заходняй Беларусі / С. Анісаў. – Мінск: Дзяржвыд БССР. Рэд. паліт. літ., 1958. – 66 с.
2. *Анісаў, С.* За волю і шчасце народа: Запіскі падпольшчыка / С. Анісаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР. Рэд. сац.-экан. літ., 1959. – 164 с.
3. *Анісаў, С.* Крутымі шляхамі: Запіскі былога камсамольскага работніка-падпольшчыка / С. Анісаў. – Мінск : Дзяржвыд БССР. Рэд. сац.-экан. літ., 1960. – 185 с.
4. *Арэхва, М. С.* Рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі ў гады белапольскай акупацыі / М. С. Арэхва. – Мінск : Т-ва па распаўсюджванні палітычных і навуковых ведаў БССР, 1958. – 32 с.
5. В борьбе за счастье народное // Люди Нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны: сборник / сост. : И. Ф. Климов [и др.] ; Редкол. : И. Ф. Климов (рук.) [и др.]. – Минск : Беларусь, 1975. – С. 43–114.
6. *Ваупшасов, С. А.* На разгневанной земле / С. А. Ваупшасов. – Минск : Беларусь, 1965. – 344 с.
7. *Ваўпшасаў, С. А.* На разгневанай зямлі / С. А. Ваўпшасаў / Літ. апрац. В. Бурносаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР. Рэд. сац.-экан. літ., 1963. – 232 с.
8. *Ваўпшасаў, С. А.* На разгневанай зямлі / С. А. Ваўпшасаў // Полымя. – 1963. – № 1. – С. 141–160.
9. Вильнюсское подполье. Воспоминания участников революционного движения в Вильнюсском крае (1920–1939 гг.): сб. воспоминаний. – Вильнюс : Vaga, 1966. – 397 с.
10. Годы испытаний и мужества: сб. воспоминаний / сост.: Н. С. Орехво, Н. С. Сташкевич; под ред. Н. Ф. Капич [и др.]. – Минск : Беларусь, 1973. – 415 с.
11. За правильное освещение истории Компартии Западной Белоруссии // Коммунист. – 1964. – № 8. – С. 68–79.

12. К вопросу об истории Коммунистической партии Западной Белоруссии // Коммунист Белоруссии. – 1957. – № 8. – С. 25–36.
13. *Молочко, Н. П.* О прожитом и пережитом / Н. П. Молочко. – Минск: Беларусь, 1989. – 191 с.
14. *Муха-Мухновский, Г.* Пути-дороги / Г. Муха-Мухновский. – Минск : Беларусь, 1973. – 207 с.
15. Пісьмы Арэхвы М. С. родным, сябрам, знаёмым // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 976. – Воп. 1. – Спр. 41.
16. Пісьмы Абрамавай В., Адзінца М. Р., Бергман А., Броўкі П. Арэхве М. С. // НАРБ. – Фонд 976. – Воп. 1. – Спр. 47.
17. Пісьмы Бергмана С., Бучані Г., Вілно С. (Wilno S.), Верна Г. (Werna) (Польшча) Арэхве М. С. // НАРБ. – Фонд 976. – Воп. 1. – Спр. 48.
18. Пісьмы Вайцюша В. Н., Галашкіна В.І., Давідовіч М. А. і інш. // НАРБ. – Фонд 976. – Воп. 1. – Спр. 49.
19. Пісьмы Крэйна Г. А., Кэмрада С., Ласковіча В. П., Лебедзева Г. А., Лебедзеўскага Н. А., Маісеенка А. Г., Маліноўскага С. (Польшча), Малько С. М. (Польшча), Мальца І. В. М. В. Арэхве // НАРБ. – Фонд 976. – Воп. 1. – Спр. 51.
20. Пісьмы Марэйчыка Н. М., Матэнскага В. (Польшча), Мілера Л. С., Міхайлоўскага М. (Польшча), Мотля Э. (Mutyl) (Польшча), Насовіча М. (Польшча), Петракоўскага, Пучыка Л. Я. Арэхве М. С. // НАРБ. – Фонд 976. – Воп. 1. – Спр. 53.
21. Пісьмы Хабоўскага В., Хаванава Е., Харужай В. З., Цыгельніцкай Ф. А., Чэхія І. В., Чэрушава М. С., Шамайціса Р., Юрцэвіча Р. В., Ярашэнкі А. Арэхве М. С. // НАРБ. – Фонд 976. – Воп. 1. – Спр. 55.
22. Спіс публікацый Арэхвы М. С. за 1923–1924, 1957–1983 гг. // НАРБ. – Фонд 976. – Воп. 1. – Спр. 58.
23. Они не стали на колени : Сб. воспоминаний и документов о концлагере Береза Картузская / [Ин-т истории партии при ЦК КПБ – филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. Архивное упр. при Совете Министров БССР]; [Сост. и лит. обработали канд. ист. наук В. Поссе и Л. Аржаева]. – Минск : Беларусь, 1966. – 347 с.
24. *Орехво, Н.* Недостатки одного издания / Н. Орехво, И. Семеников, Л. Шайковский // Коммунист Белоруссии. – 1966. – № 6. – С. 74–75.
25. *Орехво, Н. С.* Дела и люди КПЗБ: воспоминания / Н. С. Орехво. – Минск : Беларусь, 1983. – 287 с.
26. *Пашкевіч, А.* Справа «Беларускага нацыянальнага цэнтра» паводле сведчанняў былых актывістаў Кампартыі Заходняй Беларусі / А. Пашкевіч // Спадчына. – 2006. – № 1. – С. 102–116.
27. *Савіч, А. А.* Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады) : гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкина. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2012. – 288 с.
28. Славная дочь белорусского народа : письма, статьи В. З. Хоружей и воспоминания о ней / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; [сост. : Н. С. Орехво, И. П. Ховратович]. – Минск : Госиздат БССР, Редакция соц.-экон. лит., 1962. – 328 с.
29. Славная дочь белорусского народа : письма, статьи В. З. Хоружей и воспоминания о ней / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск : Гос. изд-во БССР, 1960. – 228 с.
30. Слаўная дачка беларускага народа : пісьмы, арт. В. З. Харужай і ўспаміны аб ёй / Ін-т гісторыі партыі пры ЦК КПБ – філіял Ін-та марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1960. – 226 с.
31. У суровыя гады падполля: успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі / Ін-т гісторыі партыі ЦК КП Беларусі – філіял Ін-та марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС ; склад. : М. С. Арэхва [і інш.]. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 361 с.
32. Протоколы заседания секторов Института истории (сектор истории БССР советского периода) // Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 265.

*A. A. SAVICH*

**M. S. AREKHVA'S EPISTOLARY HERITAGE AS SOURCE OF THE WEST BELARUS HISTORY**

## Summary

In the forming of historiography traditions to elucidate the Western Belarus history in 1921–1939 years significant place belongs to veterans of the revolutionary movement as well as to members of the Communist Party of Western Belarus (KPWB).

Thanks to them the party-government bodies intervention into the historical scientific studies has been implemented. That is particularly true for M. S. Arekhva's scientific and journalistic activity who was a member of the KPWB governing body during the 1921–1939 years. Also he was initiator and organizer for the Western Belarus studies.

Developed original historiographical situation where reconstruction and interpretation of the stories involved persons who investigated the events played a key role, including the authors of the sources has been shown in the form of different party document kinds. Special historiographical situation has been arisen when reconstruction and interpretation of the history were in hands of the same persons who played a key role in the investigated doings. For example, they became authors of the party documents. On their basis in the second half of the twentieth century active investigations of the history of Western Belarus, primarily KPWB, took place. In this process such persons were decisions-makers in the censor and methodological problems. Therefore, the correspondence of M. S. Arekhva which contains valuable information regarding to certain aspects of the Western Belarus history is an important source for the more objective understanding of the Western Belarus history and historiography. Especially it concerns to issues of organization the studies in the field of the KPWB history.